Песню бярыце з сабою...

Рубрыку вядзе
кампазітар
Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

ДЗЕ Б НІ БЫЎ

Якуб Колас (1882—1956) — знакаміты беларускі пісьменнік, драматург, паэт і перакладчык, грамадскі дзеяч. Адзін з класікаў і стваральнікаў новай беларускай літаратуры. Народны паэт БССР з 1926 г. Акадэмік Акадэміі навук БССР з 1928 г. Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1934 г.

Вершы — Якуб КОЛАС,
музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.

1. Дзе б ні быў я, што б ні думаў, —
Ты паўсюль са мною
І мне свеціш у той цемры
Яснаю зарою.

Прыпеў:
Дзе б ні быў,
Што б ні думаў я,
Ты заўжды, заўжды са мною
Зорка ясная.

2. Толькі ж леглі паміж намі
Берагі крутыя,
Нам пуцінкі завалілі
Камяні ліхія...

Прыпеў.

3. Згодна ў полі ўдоўж дарогі
Каляінкі ўюцца,
Ды ніколі між сабою
Яны не сальюцца.

Прыпеў.



У СТАМБУЛ, «ГОРАД КАНТРАСТАЎ»

«Белавія» правяла распродаж квіткоў па 13 напрамках

Авіякампанія правяла распродаж квіткоў на сайце www.belavia.by. У акцыю былі ўключаны 13 напрамкаў, у тым ліку Дубай, куды ў гэтую пятніцу авіякампанія здзейсніць свой першы рэгулярны рэйс. За суткі было прададзена больш за тры тысячы месцаў, а самымі папулярнымі напрамкамі сталі Стамбул, Адэса, Кіеў, Варшава і Бялград.

У дзень правядзення акцыі колькасць наведвальнікаў сайта ўзрасла больш чым у пяць разоў: замест стандартных 20 тысяч учора іх колькасць перасягнула 110 тысяч.

Найбольшым попытам у пасажыраў «Белавія» карыстаўся Стамбул. На гэты напрамак было набыта 1134 месцы. Кошт білета ў абодва бакі склаў 78 еўра (+ таксы і зборы). Другім па папулярнасці напрамкам стала Адэса з коштам білета 55 еўра (+ таксы і зборы) за палёт туды-назад. На рэйс у Адэсу білеты купілі 352 чалавекі, цана ў абодва бакі была 55 еўра (+ таксы і зборы). У топ-3 па продажах увайшла і сталіца Украіны. Усяго ў гэты горад было набыта 277 месцаў па цане 38 еўра (+ таксы і зборы) за білет туды і назад. Пяцёрку самых запатрабаваных гарадоў для падарожжа замыкаюць Варшава (272 месцы) і Бялград (253 месцы). Білеты з Мінска ў Варшаву і назад каштавалі 31 еўра (+ таксы і зборы), а ў Бялград — 52 еўра (+ таксы і зборы).

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты | Падзеі | Людзі

19 ЛЮТАГА

У краіне

1851 год — нарадзіўся (Мінск) Конрад Прушынскі, асветнік, папулярызатар навукі. Аўтар папулярных кніг па геалогіі, астраноміі, прыродазнаўстве, гісторыі і сельскай гаспадарцы. Абраны ганаровым членам Таварыства ў Галіцыі (1906), Польскага таварыства адукацыі ў Вільні і Мінску (1907).

1861 год — нарадзіўся Якуб (Якаў Раманавіч) Брайцаў, пісьменнік, драматург, паэт.

1906 год — нарадзіўся Фёдар Дзмітрыевіч Гахаў, беларускі вучоны-матэматык, акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар.

1921 год — нарадзіўся Яраслаў Антонавіч Вашчак, дырыжор, народны артыст СССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1816 год — у Рыме адбылася прэм'ера оперы Джаакіна Расіні «Севільскі цырульнік», напісанай усяго за 13 дзён. Першае выкананне оперы праваліласяя, другое прынесла поспех, а трэцяе — сусветную вядомасць аўтару.

1861 год — імператар Аляксандр II падпісаў Маніфест аб адмене прыгоннага права і Палажэнні аб сялянах, што выйшлі з прыгоннай залежнасці.

1921 год — выйшаў у свет першы нумар газеты «Труд» — органа расійскіх прафсаюзаў.

1931 год — нарадзілася Ала Дзмітрыеўна Ларыёнава, расійская артыстка кіно, народная артыстка Расіі.

1946 год — нарадзіўся Аляксандр Уладзіміравіч Чайкоўскі, расійскі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, народны артыст Расіі.

1956 год — нарадзіўся Алег Рыгоравіч Міцяеў, расійскі акцёр, бард, народны артыст Расіі.

1986 год — па першай агульнасаюзнай праграме Цэнтральнага тэлебачання быў паказаны міжкантынентальны тэлемост «Ленінград—Сіэтл», удзельнікамі якога ўпершыню сталі простыя людзі СССР і ЗША.

Так гаварыў...

ВАЛЬТЭР:

«Знаць шмат моў — значыць мець шмат ключоў да аднаго замка».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.20	18.27	10.07
Віцебск —	8.13	18.14	10.01
Магілёў —	8.10	18.17	10.07
Гомель —	8.04	18.17	10.13
Гродна —	8.35	18.43	10.08
Брэст —	8.32	18.47	10.15

Месяц

Першая квадра ***ў 21.48.***

Месяц у сузор'і ***Блізнят.***

Імяніны

Пр. *Марфы, Марыі, Хрысціны, Анатоля, Васіля, Дзмітрыя, Івана, Максіма, Юльяна.*
К. *Міраславы, Арнольда, Міраслава, Пятра.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Сынок, запомні: каб быць добрым чалавекам, ты павінен заўсёды быць пунктуальным і асцярожным.

— А што значыць пунктуальным?

— Гэта значыць заўсёды выконваць тое, што паабяцаў.

— А асцярожным?

— Каб ніколі нічога не абяцаць.

Наваколь-ныя дзеляцца на дзве катэгорыі: тых, хто мяне хваліць, і тых, якія абсалютна не разбіраюцца ў людзях.

— І дзе ты ўзяў грошы на такое шыкоўнае вяселле?

— Я ж усё жыццё адкладваў на чорны дзень...

Яна зразумела, што трэба худзець, калі аступілася і ўпала ў адкрыты люк, але не праваліласяя.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 361. Нумар падпісаны ў 19.30 18 лютага 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12